Источник: "Звязда" - 2016-06-24

ЦІ БУДЗЕМ СЁЛЕТА З ГРЫБАМІ І ЯГАДАМІ?

Навукоўцы прадставілі вынікі даследавання на гэтую тэму

Прагнозныя паказчыкі (балы) плоданашэння ягадных раслін і ядомых грыбоў падрыхтаваны па выніках маніторынгу Нацыянальнай акадэміі навук у лясным фондзе Беларусі ў красавіку–чэрвені бягучага года на 10 пастаянных пунктах назірання і 61 часовай пробнай плошчы.

Паводле даследаванняў, у Віцебскай вобласці прагназуецца ўраджай чарніц, вышэйшы за сярэдні (4 балы), у астатніх рэгіёнах чакаецца сярэдняя ўраджайнасць ягадніка – 3 балы.

Нават пры спрыяльным летнім надвор'і ўраджай брусніц у Віцебскай і Мінскай абласцях абяцае быць сярэднім (3 балы), у Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай — трохі ніжэй за сярэдні — 2 балы.

Прадукцыйнасць буякоў у Віцебскай і Гомельскай абласцях чакаецца сярэдняй (3 балы), у астатніх рэгіёнах Беларусі — ніжэйшай за сярэднюю (2 балы). Ніжэйшай за сярэднюю (2 балы) чакаецца і ўраджайнасць журавін у Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях. А вось у Віцебскай вобласці ўраджай гэтага віду прагназуецца вышэйшым за сярэдні (4 балы).

Надвор'е ў красавіку-маі адбілася на цвіценні ягаднікаў, у першую чаргу чарніц. З-за няўстойлівага і халоднага надвор'я ў першай дэкадзе чэрвеня на ўсёй тэрыторыі Беларусі адбыўся больш інтэнсіўны, чым меркавалася, адпад бутонаў, кветак і завязяў.

У сувязі з павышаным тэмпературным фонам і ўзрастаннем вільготнасці глебы ў сярэдзіне красавіка—першай палове мая ва ўсіх рэгіёнах Беларусі адзначаны страчкі і смаржкі, а на поўдні зафіксавана першая хваля белых грыбоў, падбярозавікаў і чырвонагаловікаў. У Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях з'явіліся масляты і лісічкі. Аднак рост пладовых цел ядомых грыбоў месцамі быў кароткачасовым з-за дэфіцыту вільгаці ў глебе (дажджы ішлі лакальна) і значнага пахаладання ў канцы мая—пачатку чэрвеня. У першай палове чэрвеня ў лясах практычна па ўсёй тэрыторыі поўдня краіны адзначаны лісічкі.

Прагнозныя паказчыкі па тым, колькі вырасце ядомых грыбоў (на падставе сярэдніх шматгадовых даных і метэаралагічных умоў мінулага і бягучага года, якія аказваюць уплыў на фарміраванне ўраджаю грыбоў у 2016 годзе), наступныя. Паводле вынікаў маніторынгу, ураджай баравікоў, чырвонагаловікаў, падбярозавікаў і лісічак па ўсіх абследаваных абласцях, акрамя Віцебскай, чакаецца ніжэйшым за сярэдні (2 балы), апенек асенніх — сярэдні (3 балы). Пры дастатковай колькасці ападкаў у летнія месяцы (ліпень-жнівень), а таксама ў верасні, плоданашэнне ўсіх відаў ядомых грыбоў па асобных тэрыторыях ляснога фонду Беларусі можа аказацца больш высокім.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сяргей Расолька. Ці будзем сёлета з грыбамі і ягадамі?